жыдоўскае нацыі перакінуўся ў расейскую. Чалавек гэты, па фаміліі Горвіц, а па–газэтнаму прозьвішчу Самойлаў, калі тварыўся блёк нацыянальных меншасьцяў, страшэнна хацеў убіцца туды пад фірмай „расейскіх эсэраў“, якіх у Польшчы няма. Яго не пусьцілі. Тады была пушчана ў газэтах чутка, быццам у Піншчыне заснавалася партыя „беларускіх трудавікоў“. Але зара выясьнілася, што гэткае партыі ў Піншчыне зусім няма і ніколі не было, а ўсю штуку выдумаў усё той жа Горвіц–Самойлаў, каб пад беларускім імем рабіць варожую нам работу. Цяпер агент Горвіца, нейкі Кавэрда, езьдзіць з гэтай мэтай на Горадзеншчыне, але там яму ніхто веры не дае.

Як ужо ведама, да Беларускага Цэнтральнага Выбарнага Камітэту далучыліся і *тутэйшыя* расейцы. Але, апрача *тутэйшых,* ёсьць у нас многа і расейскіх эмігрантаў з Савецкай Расеі, зусім чужых нашаму краю. Вось жа знайшліся між імі людзі, для якіх згода зь беларусамі зьяўляецца сольлю ў ваччу. Стары царскі слуга, колішні маршалак шляхты Баразьдзін ня мог сьцярпець, што „хамы“ беларускія, якіх ён некалі і за людзей не лічыў, маняцца правадзіць сваіх паслоў у Сойм і ў Сэнат. І сабраўшы кампанію старых царскіх паліцэйскіх і новых польскіх шпікоў, пачаў ён муціць ваду сярод расейцаў, каб тыя адступіліся ад беларусаў. Ды і гэта — дарма: ня так ужо лёгка разьдзяліць людзей, якіх згуртавала сьвядомасьць і пераконаньне, што толькі ў еднасьці ратунак для нас усіх, якія глядзяць на наш край, як на сваю Бацькаўшчыну.

Мо йшчэ будзе зроблена не адна спроба правакацыі, не адна спроба разьбіць адзіны беларускі фронт і еднасьць нацыянальных меншасьцяў Польшчы. Ды мы цьвёрда перакананы, што ніхто на гэту правакацыю ня пойдзе. Даволі ўжо баламуцілі наш народ і маскоўскія чыноўнікі, і польскія паны, і адміністрацыя: народ больш ня пойдзе на ману і ашуканства.

Адзіны беларускі фронт даволі моцны. Ганьбіць яго імя ня ўдасца нікому.

## 16

Ужо ведамы нумар сьпіску кандыдатаў у Сойм і Сэнат, за каторы на ўсенькім абшары Польскага гаспадарства будуць падаваць голас усе грамадзяне няпольскае нацыянальнасьці.

Нумар гэты — *шаснаццаты.*

Пад гэтым нумарам у беларускіх акругох выставіць кандыдатаў у Сойм і Сэнат ад імя арганізаванага Беларускага грамадзянства Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт.

Каля гэтага нумару павінны згуртавацца, павінны даць за яго галасы ўсе сапраўдныя сыны Беларускага народу.

Людзі, якія будуць выстаўлены на сьпісках пад нумарам шаснаццатым, — гэта косьць з косьці і кроў з крыві нашага працоўнага народу. Сам жа народ на перадвыбарных зьездах у кожным акрузе зацьвердзіць кандыдатаў у Сойм і Сэнат.

У тым–та і сіла сьпіску нумар шаснаццаты. Гэта ж і зьяўляецца прычынай таго, што розныя чорныя сілы ўжо распачалі барацьбу проці яго.

Проці нашага сьпіску згоднай хэўрай падняліся і польскія эндэкі, і польскія дэмакраты розных кірункаў, і ўсе тыя, хто жыве, падбіраючы крошкі з панскага стала. Проці нашага сьпіску паны змабілізавалі і так званых „беларускіх беспартыйных актывістаў“, выслугуючыхся дэфэнзіве, і фальшывых расейскіх эсэраў ці трудавікоў, якія пад штандарам сацыялізму стараюцца разьбіць еднасьць беларускага грамадзянства і адцягнуць яго ад саюзу з другімі бяспраўнымі народамі Польскага гаспадарства. І вось розныя ваўкі ў авечай скуры будуць падхадзіць да нашага сялянства, будуць салодкімі словамі і брахлівымі абяцанкамі падманваць нашу вёску на адступніцтва ад вялікае справы барацьбы за нашае права, волю, зямлю.

Ня верце ім, беларусы, бо на думцы ў іх у усіх — адно: нашымі галасамі прайсьці ў Сойм і там фальшаваць вашу волю. Ня верце, бо ўсе гэтыя чужыя нам партыі, кіраваныя

варшаўскімі верхаводамі, прымусяць вас заплаціць страшэнную цану за кожын за іх жа пададзены на выбарах голас: выбіраючы іх кандыдатаў, паслухмяных Варшаве, вы самі сабе наложыце пятлю на шыю, самі сабе выкапаеце магілу.

Верце і падавайце свой голас адно толькі за сьпісак Блёку Нацыянальных Меншасьцей № 16, дзе кандыдатаў упіша згодна з вашай воляй Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт.

## Фальшывае самаўпраўленьне

Мы ўжо пісалі ў „Звоне“[1] аб тым, што на выбарах у гмінныя рады, якія адбываліся гэтым летам, шмат дзе народ выявіў вялікую сьвядомасьць і павыбіраў людзей, што безумоўна будуць бараніць народныя патрэбы і правы ад усіх, хто будзе пасягаць на іх. Склад гмінных рад часта–густа бывае цяпер чыста беларускі. У рэзультаце там, дзе дагэтуль гаспадарылі назначаныя ўладай палякі — паны і паўпанкі, дзе школы беларускія зачыняліся і разганяліся, дзе ўрадовая статыстыка знаходзіла адно толькі „польскае“ насяленьне, — там цяпер зычна гудзіць беларускі голас, і новыя гмінныя рады выракаюцца гвалтам заведзеных польскіх школ, пастанаўляюць адкрываць беларускія школы. Ня будзем пералічаць усіх тых месц, дзе народ беларускі здалеў на выбарах гмінных рад выявіць сваё аблічча. Даволі адзначыць, як прыклад, хоць бы Пастаўскую гміну, якая пастанавіла адкрыць 16 беларускіх школ, — а такіх гмін усё больш прыбывае.

Выяўленьне[м] права выбарнасьці ў гміне зьяўляецца, паміж іншым, права выбару войта. Гэта зусім цьвёрда ўстаноўлена законам. Зусім зразумела, што раз склад гміны — беларускі, дык гмінная рада выбірае за войта свайго ж беларуса. Вось гэтага польская адміністрацыя сьцярпець ня можа: у такіх прыпадках старасты[2] ня толькі не зацьвярджаюць выбарных войтаў, а проста назначаюць угодных сабе людзей на гэтае выбарнае становішча. Цікавы прыклад гэткага нарушэньня выбарнасьці дае Нова–Пагосцкая гміна.

Тутака ўлетку гміна выбрала за войта свайго чалавека, Чарвінскага (8 галасоў за і 2 процi). Стараста адмовіўся зацьвярдзіць яго і загадаў зрабіць новыя выбары. На другіх выбарах ізноў выбралі таго ж Чырвінскага, але цяпер ужо аднагалосна; за яго падалі свае галасы і тыя, хто раней быў процi яго. Стараста ізноў не зацьвярдзіў яго і безь ніякіх выбараў назначыў за войта суседняга паўпанка Федаровіча. Ды гэтага пану старасьце выдалася мала: каб забраць у рукі непакорную гмінную раду, выселілі даўнейшага пісара — тутэйшага чалавека і на яго месца насадзілі новага, выпісанага ажно з Каліша.

Мы гаворым аб Новым Пагосьце, як аб *прыкладзе*, бо гэта ж цэлая напярод задуманая сыстэма нішчэньня беларускага ўплыву на самаўпраўленьне. З гэтай сыстэмай можна змагацца толькі адным спосабам: у Сойме і Сэнаце. А дзеля гэтага яшчэ раз скажам: *глядзіце, беларусы, каб паслалі туды такіх дэпутатаў, якіх не перакупяць ні панская ласка, ні грошы, ні ўсялякія пасулы і абяцанкі.*

*Дык жа ўсе на выбары — дружна, адналіта як сьцяна!*

*Усе падавайце галасы за сьпісак, які абвесьціць Беларускі Цэнтральны Выбарны Камітэт.*

## Самі за сябе!

У часе прадвыбарнае агітацыі па Зямлі Беларускай будзе выступаць вялікая чарга розных партыяў.